# Чытачу!

Зараз Ты заглянуў на першую старонку ***Зялёнага краю***, першага нумару 2000 году — гэта новы твар таго выданьня, якое, мажліва, Ты памятаеш з 96–97 гадох (тады гэта быў “Зялёны весьнік EcoInform”).

*Зялёны край* створаны й робіцца, каб спрыяць “зялёнай” сьвядомасьці й дзейнасьці ў Беларусі. Мы будзем падаваць **бягучую інфармацыю** пра стан у акаляючым Асяродзьдзі, пра **зялёны рух** у Беларусі, Польшчы, Украіне ды іншых краінах Сярэдняй Эўропы, у Заходняй Эўропе, Расеі і ў больш аддаленых мясьцінах…

Нас цікавіць **match розна бачаньне** праблемаў і шляхоў іхнага вырашэньня… На старонках *Зk* можна будзе знайсьці і тэарэтычныя **разважаньні**, і практычныя **веды**, праграмы й **праекты**, паведамленьні пра **акцыі** і **тэндэнцыі** ды яшчэ чаго іншага… Дарэчы, мы падтрымваем ідэю вольнага распаўсюду інфармацыі, і на старонках *Зk* знойдуць месца й перадрукі зь іншых выданьняў, якія падаюцца нам **цікавымі**.

Зьмест і выгляд *Зk* будзе няспынна мяняцца.

У эколягаў ёсьць панятак “біялягічная разнастайнасьць”. Варта паспрыяць культурнай разнастайнасьці ў нашым рэгіёне, у нашай Беларусі. Культурны **дыялёг** і беларускія **традыцыі** зоймуць паважнае мейсца на старонках *Зk*.

Але!

**Безь Цябе, Чытачу, гэта немажліва.** Ты ўжо адразу заўважыў, як зараз *Зk* нагадвае маленькую брашурку, якіх нямала… А ён мае намер вырасьці ў адмысловы часапіс, стаць **ТОЎСТЫМ** і прыгожым. І разьлічвае ў гэтым на **Тваю падтрымку**.

Будзьма абменьвацца думкамі, ідэямі, занатоўкамі ды малюнкамі, паведамленьнямі ды аб’яўкамі…

*Рэдакцыя.*

# ГЭТЫ ПРАЕКТ

— міжнародны, беларуска-польскі.
Партнэрам з польскага боку выступае Выдавецтва “*Zielone Brygady*” пад началам Анджэя Жвавы, якое ад канцу 80-х выдала болей за 40 кніжак на экалягічныя, грамадзкія тэматы, а таксама ў пытаньнях правоў чалавека, міру, здароўя, культуры ды іншага. З 1989 году выходзіць найпрацяглы грамадзкі экалягічны часапіс “*Zielone Brygady. Pismo ekologów*” (ZB), які ў польскім “зялёным” руху ўсе лічаць за “свайго” дзякуючы нэйтральнай пазыцыі.
Дарэчы, гэты часапіс чытач можа знайсьці ў менскай Цэнтральнай бібліятэцы імя Я.Купалы (вул.Харужай,16) або на адрэсе <www.most.org.pl/zb>.
З польскага боку праект каардынуе Станіслаў Гурка, актыўны ўдзельнік зялёнага руху, журналіст і сувыдаўца.
Зь беларускага боку партнэрам выступае ...э-э, група таварышаў :-) , ці “нефармальная суполка грамадзянаў”, вядомая па-за межамі дзейнасьці беларускага заканадаўства як Група “*ЭкаІнформ*” (раней: Інфармацыйная група “Школа-2”/“Школа-Два” ды Фракцыя “Клёк”...). Суполка нерэгістраваная і юрыдычна ня існая. Тым ня менш, увесну ’96 Група распачала праект «ЭкаІнформ» (электронны й друкаваны бюлетэнь). Улетку ’97 сябры Групы ўзялі ўдзел у блякадзе Цімелінскай АЭС і дзейнасьці чэскіх “Брыгадаў Чыстай Энэргіі”, а ўлетку ’98 Група брала ўдзел у падрыхтоўцы й правядзеньні міжнароднага маршу “За бязатамную Беларусь!”. Акрамя бюлетэню Група выдрукавала колькі кніжак пра экалягічную інфармацыю ў інтэрнэце, энэргетыку й праўныя падставы “зялёных” акцыяў.

*Каардынатар зь беларускага боку* ***Максім Капран****.*

# Конкурс!

Увага, малады журналіст, пачынальнік ці аматар, Чытачу!..
Рэдакцыя *Зk* аб'яўляе **конкурс на лепшы журналісцкі матэрыял** — пішы пра экалягічны стан у той мясцовасьці, дзе жывеш. Якія ёсьць праблемы, якія захады ў іхным вырашэньні робяць улады, грамадзкія арганізацыі ці "простыя" людзі…
На працягу шасьці нумароў мы будзем друкаваць артыкулы, дасланыя на конкурс, і паводле падсумаваньня водгукаў чытачоў ды рашэньня кампэтэнтнага журы пераможцы будуць уганараваныя каштоўнымі прызамі.
Напішы цікавы матэрыял — і займай Першае месца. Атрымаеш добрую журналісцкую прыладу — **дыктафон**…

Дасылай артыкулы на адрэсу:
**а/с 68, Менск, 220047, Беларусь**
e-mail: **zialonykraj@europe.com**

* * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * * *

# Конкурс!

Внимание, молодой журналист, начинающий или любитель, Читатель(-ница)!..
Редакция *Зk* объявляет **конкурс на лучший журналистский материал** — пиши про экологическое положение в том месте, где живёшь. Какие есть проблемы, какие меры в их решении предпринимают власти, общественные организации или "простые" люди…
На протяжении шести номеров мы будем печатать статьи, присланные на конкурс, и в итоге откликов читателей и решения компетентного жюри победители получат ценные призы.
Напиши интересный материал — и занимай Первое место. Получишь необходимый в журналистике инструмент — **диктофон**…

Присылай статьи на адрес:
**а/я 68, Минск, 220047, Беларусь**
e-mail: **zialonykraj@europe.com**